Серада, 16 Чэрвень 2021

«Два ДБ». Паўтара года абмежавання волі – за каментар у «Аднакласніках» на адрас міліцыянтаў

Друкаваць (/news/sud/item/4048-za-kamentar-u-adnaklasnikakh?tmpl=component&print=1) | Эл. пошта (/component/mailto/?tmpl=component&template=lt_news&link=8bead0e22a49c1961af392f7046bdc79206009e9)

Ацаніць гэты матэрыял (4 галасоў)



(/media/k2/items/cache/1413b60ec66b1c98e041981ff192d5de_XL.jpg)

У судовай зале

58-гадовы інжынер з Віцебску Васіль Глушакоў **(/news/sud/item/4047-kamentar-u-grupe-tarakan-vusaty)**быў прызнаны вінаватым у публічнай абразе прадстаўнікоў улады ў сувязі з выкананнем імі службовых абавязкаў (арт. 369 КК). За кароткі каментар на адрас двух супрацоўнікаў Дубровенскага РАУС у суполцы «Вусаты Таракан» мужчыну прысудзілі да 1 году і 6 месяцам абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу («хімія»). Прысуд агучыла 16 чэрвеня суддзя Алена Грабянчук.

Суд Чыгуначнага раёну Віцебску абавязаў таксама **Васіля Глушакова** выплаціць кампенсацыю маральнай шкоды пацярпелым міліцыянтам – па 1000 рублёў кожнаму. Апроч таго, суддзя **Алена Грабянчук** пастанавіла канфіскаваць у мужчыны мабільны

тэлефон – як прыладу злачынства.

Каментар, за які быў асуджаны Васіль Глушакоў, быў пакінуты 7 лютага 2021 году ў групе «Вусаты Таракан» у сацыяльнай сетцы «Аднакласнікі» пад постам пра тое, як дубровенскія міліцыянты канфіскоўвалі паветраныя шарыкі. Нагадаем, 15 студзеня ў Дуброўне за бел-чырвоныя стужкі быў арыштаваны (/news/zatrymanni/item/3856-zatrymali-mikhaila-chamuraku) і асуджаны на 7 сутак мясцовы прадпрымальнік **Міхаіл Чамурака**. У ягоным доме тады адбыўся ператрус – былі канфіскаваныя шарыкі, якія віселі на акне.

> *«Супрацоўнікі Дубровенскага РАУС канфіскоўвалі шарыкі, а два вызначыліся тым, што рызыкавалі нават здароўем і жыццём… І я не канкрэтна ім адказаў, а адказаў таму, хто даваў заўвагі. Я напісаў, што «два ДБ». Так, скарочана»*, – расказаў пасля абвяшчэння прысуду Васіль Глушакоў.

Мужчына знаходзіцца пад падпіскай аб нявыездзе і збіраецца абскардзіць прысуд, які пакуль не набыў законнай моцы.

Жамчужны: Гэта жорсткі прысуд

На думку былога палітвязня і праваабаронцы **Міхаіла Жамчужнага**, прысуд Глушакову *«не адэкватны ўчыненаму».*

«Вельмі здзіўляюся жорсткасці і несправядлівасці рашэнняў судовых органаў. Я не ведаю, дзе навучаліся суддзі і якіх мэтаў дамагаюцца, але лічу, што гэта вельмі жорсткі прысуд. Некаторыя кажуць, што паўтара года «хіміі» – гэта больш жорстка, чым паўтара года ў калоніі. Хлопцы скардзяцца, што там ніякіх бытавых умоваў няма», – сказаў Міхаіл Жамчужны.

Уладзімір Бяляўскі

Апублікавана ў Суд (/news/sud)

Тэгі: Васіль Глушакоў (/itemlist/tag/Васіль%20Глушакоў) артыкул 369 КК (/itemlist/tag/артыкул%20369%20КК) Алена Грабянчук (/itemlist/tag/Алена%20Грабянчук)

Яшчэ ў гэтым разьдзеле: « 58-гадовага інжынера судзяць за каментар у групе «Таракан вусаты». Пракурор просіць 3 гады «хіміі» (/news/sud/item/4047-kamentar-u-grupe-tarakan-vusaty) У Віцебску пачалі судзіць мужчыну, які нібыта зняважыў амапаўца Дзмітрыя Балабу » (/news/sud/item/4052-znyavazhyu-amapautsa-balabu)

Вярнуцца ў пачатак (/news/sud/item/4048-za-kamentar-u-adnaklasnikakh#startOfPageId4048)

© 2011 - 2023 Віцебская вясна (/). Пры выкарыстаньні матэрыялаў абавязковая гіпэрспасылка. Email: vitebskspring@proton.me (mailto:vitebskspring@proton.me)

(Https(/